# § 25. Кіраванне Кацярыны II

**1768—1774 гг. 1773—1775 гг. 1785 г. 1787—1791 гг.**

**Успомніце.** *Калі ў Расіі было заканадаўча афармлена прыгоннае права? Якімі былі галоўныя задачы знешняй палітыкі Рускай дзяржавы ў XVI–XVII стст.?*

Цараванне Кацярыны II стала важным этапам у гісторыі Расійскай дзяржавы. Тэрыторыя Расіі ў гэты час пашыралася ў паўднёвым і заходнім кірунках, насельніцтва вырасла ў два разы. Палітыка Кацярыны II была накіраваная на ўмацаванне дзяржаўнай улады і пазіцый дваранства.

**Вы даведаецеся.** *Якім чынам Кацярына II прыйшла да ўлады. Якія змены адбыліся ў Расіі за гады яе праўлення.*

**1. Палацавыя перавароты.** Пётр I памёр, не прызначыўшы спадкаемца на расійскі трон. Паміж рознымі групоўкамі радавітай знаці распачалася жорсткая барацьба за ўладу. Пры гэтым вырашальную ролю ва ўзвядзенні на трон адыгрывала гвардыя — адборная і прывілеяваная частка расійскіх войскаў.

У 1725–1762 гг. на расійскім троне змянілася шэсць правіцеляў. Гэты перыяд у гісторыі Расіі называецца «эпохай палацавых пераваротаў». Правіцелі на троне мяняліся, але сутнасць і асновы самадзяржаўя заставаліся нязменнымі.

**2. Прыход да ўлады Кацярыны II.** Становішча стабілізавалася ў эпоху кіравання ***Кацярыны II***, якая правіла ў ***1762–1796 гг.*** Яна атрымала карону дакладна гэтак жа, як і яе папярэднікі, — у выніку палацавага перавароту.



Партрэт Кацярыны II.
Мастак *Іван Аргуноў*. 1762 г.




Эпоха палацавых пераваротаў
234

Кацярына была немкай з паходжання. Нарадзілася ў знатнай, але збяднелай дваранскай сям'і ў Прусіі. У 1745 г. выйшла замуж за нашчадка рускага трона. Яе муж, Пётр III, стаў імператарам у 1762 г., але неўзабаве быў забіты групай афіцэраў-змоўшчыкаў.

Законным спадкаемцам трона лічыўся сын Кацярыны — Павел. Аднак Кацярына заручылася падтрымкаю гвардзейскіх афіцэраў і абвясціла сябе імператрыцай. Усе, хто дапамог ёй захапіць уладу, атрымалі шчодрую ўзнагароду.

Кацярына II кіравала Расіяй 34 гады. Яна мела цвёрды і рашучы характар, была разумным і моцным правіцелем, здолела далучыць да Расіі новыя землі і перамагчы ў войнах Асманскую імперыю і Швецыю. Пры ёй Расія ўзяла ўдзел у падзелах Рэчы Паспалітай. Імператрыца падтрымлівала ідэі Асветніцтва і ліставалася з Вальтэрам, аднак яна лічыла, што ва ўмовах Расіі немагчыма прымяніць шмат якія ідэі асветнікаў. У выніку прыгонны гнёт пры Кацярыне II толькі ўзмацніўся.

**3. Пашырэнне прывілеяў дваранства і ўзмацненне прыгонніцтва.** У другой палове XVIII ст. у Расіі праводзілася палітыка, скіраваная на ўмацаванне феадальнага землеўладання. Значныя льготы і прывілеі дваранам даваліся і раней. Але канчаткова іх замацавала і пашырыла Кацярына II.

У 1785 г. яна выдала Даравальную грамату дваранству. Дваране былі вызваленыя ад абавяз-

*З дапамогай схемы прасачыце сваяцкія сувязі расійскіх правіцеляў з Пятром I.*

ковай дзяржаўнай службы, падаткаў і павіннасцей. Істотна павялічвалася дваранскае землеўладанне. Памешчыкі надзяляліся дзяржаўнымі і палацавымі сялянамі, а таксама незаселенымі землямі. За час свайго царавання Кацярына II раздала дваранам 800 тыс. дзяржаўных і палацавых сялян. Асабліва шчодра яна ўзнагароджвала тых, каму была ўдзячная за здабыццё царскай кароны.

За багатыя падарункі расплачваліся сяляне. Феадальныя павіннасці — паншчына і аброк — узрасталі. Сялянам было забаронена скардзіцца на сваіх памешчыкаў. За гэта маглі саслаць на катаргу ў Сібір або аддаць у рэкруты.

За першыя дзесяць гадоў царавання Кацярыны II адбылося больш за пяцьдзясят сялянскіх паўстанняў у цэнтральных абласцях. Іх давялося ўціхамірваць ваеннай сілай.

**Аб'ява аб продажы прыгонных**

Прадаюцца дваровыя майстравыя людзі паводзін добрых: 2 краўцы, шавец, гадзіншчык, кухар, карэтнік, каляснік, разьбяр, залатар і 2 фурманы, якіх бачыць і даведацца пра цану можна… у самога памешчыка. Тут жа прадаюцца 3 бегавыя маладыя кані, словам адзін жарабок і 2 кані, і зграя ганчакоў, лікам пяцьдзясят.

*Як гэтая аб'ява характарызуе становішча сялян?*

**4. Паўстанне пад кіраўніцтвам Емяльяна Пугачова 1773–1775 гг.** У ***1773 г.*** выбухнула найбуйнейшае ў гісторыі Расіі народнае паўстанне. Яно пачалося ў асяроддзі яіцкага (уральскага) казацтва і распаўсюдзілася на велізарныя тэрыторыі Арэнбургскага краю, Урала і Прыўралля, Ніжняга і Сярэдняга Паволжа. У паўстанні ўдзельнічалі яіцкія казакі, прыгонныя сяляне, работныя людзі Урала, а таксама народы Паволжа — башкіры, татары, калмыкі. У кожнай з гэтых груп насельніцтва былі ўласныя прычыны для выступлення і бунту супраць улады. Але агульным для ўсіх было незадавальненне сваім становішчам. Яіцкіх казакаў, асабліва іх вярхушку, не задавальняла палітыка ўрада, накіраваная на абмежаванне прывілеяў казацтва. Сялян — узмацненне асабістай залежнасці ад памешчыкаў, рост падаткаў і павіннасцей. Работных людзей — цяжкія ўмовы жыцця і працы на заводах Урала.



Суд Пугачова. Мастак *Васіль Пяроў*. 1879 г.

*Як вы лічыце, над кім чыніць суд Емяльян Пугачоў?*

235—239

Правадыр паўстання ***Емяльян Іванавіч Пугачоў*** быў са збеглых данскіх казакаў. Ён прыйшоў на Яік і абвясціў сябе Пятром III, які быццам бы ўратаваўся ад сваіх забойцаў. Пугачоў спадзяваўся на падтрымку манархічна настроеных казакаў і сялян. Шмат хто з іх сапраўды верыў у тое, што цар стаяў за простых людзей супраць дваран. Таму дзеянні Пугачова мелі вельмі вялікі поспех.

Касцяк пугачоўскай арміі першапачаткова складалі яіцкія казакі, і толькі потым яна папоўнілася залежнымі сялянамі і работнымі людзьмі, прадстаўнікамі паволжскіх народаў. У рукі паўстанцаў перайшлі паўднёваўральскія заводы, што забяспечыла паўстанцаў артылерыяй. Шмат у якіх раёнах Паволжа пугачоўцы грамілі памешчыцкія сядзібы, палілі гарады і вёскі; многа памешчыкаў, чыноўнікаў і афіцэраў было закатавана і забіта. Гэта пра яго, пра паўстанне Пугачова, вялікі рускі паэт Аляксандр Пушкін сказаў: «Не давядзі Божа бачыць рускі бунт, бязлітасны і бессэнсоўны!»

Перапалоханы ўрад накіраваў на падаўленне паўстання рэгулярную армію. Паўстанцы былі разбітыя 25 жніўня 1774 г. за 100 км на поўдзень







Паўстанне пад кіраўніцтвам Емяльяна Пугачова

ад Царыцына. Пугачоў быў схоплены групай казакаў-здраднікаў і выдадзены ўладам. Яго пакаралі смерцю ў Маскве на Балотнай плошчы 10 студзеня ***1775 г.***

> *Як вы мяркуеце, чаму сялянскае паўстанне пацярпела паражэнне? Назавіце не менш чым тры прычыны.*

**5. Знешняя палітыка Кацярыны II.** Кацярына II працягнула барацьбу за выхад Расіі да Чорнага мора. Але гэта не задавальняла Францыю і Асманскую імперыю. Францыя імкнулася сканцэнтраваць у сваіх руках гандаль на ўсім Блізкім Усходзе. Асманская імперыя баялася прасоўвання Расіі на поўдзень. Англія таксама не хацела замацавання Расіі ў гэтым рэгіёне. Супярэчнасці паміж Расіяй і Турцыяй выліліся ў працяглыя і крывавыя войны 1768—1774 гг. і 1787—1791 гг. Дзякуючы арміі і таленавітым палкаводцам Расія выйшла з гэтых войнаў пераможцай. Усёй Расіі і Еўропе сталі вядомыя імёны Рыгора Пацёмкіна, Аляксандра Суворава, Фёдара Ушакова, Пятра Румянцава.

> *З дапамогай карты ў атласе вызначце, якія выгады даваў Расіі выхад да Чорнага мора.*

У выніку пераможных войнаў Расійская імперыя далучыла да сябе ўсё Паўночнае Прычарнамор'е. Крымскае ханства атрымала незалежнасць ад Турцыі. У 1783 г. яно было ліквідаванае і далучанае да Расіі. Такім чынам, Расія атрымала выхад да Чорнага мора і пазбылася пастаяннай пагрозы нападу крымскіх татар, за якімі стаялі Асманская імперыя



Чэсменскі бой 25–26 чэрвеня 1770 г.
Мастак *Іван Айвазоўскі*. 1848 г.

*Якое значэнне для Расіі мелі вынікі бою ў час руска-турэцкай вайны 1768–1774 гг.?*

і Англія. Дзякуючы гэтаму пачалося паскоранае гаспадарчае развіццё стэпавага поўдня Расіі, а таксама пашырэнне яе гандлёвых сувязяў з краінамі Міжземнамор'я. Былі заснаваныя новыя гарады: Нікалаеў, Адэса, Севастопаль, Херсон і інш.

Скарыстаўшыся аслабленнем Рэчы Паспалітай, Расія разам з Аўстрыяй і Прусіяй падзялілі гэтую дзяржаву паміж сабой (1772, 1793, 1795). Да Расіі адышлі Правабярэжная Украіна, беларускія землі, Літва і Курляндыя (гістарычная вобласць Латвіі).

*Прасачыце па карце ў атласе рост тэрыторыі Расійскай дзяржавы ў час кіравання Кацярыны II.*

*Перыяд праўлення Кацярыны II быў сапраўды «залатым векам» для рускага дваранства. Аднак яго прывілеі шмат у чым пашыраліся за кошт узмацнення сялянскай залежнасці ад памешчыкаў. Народнае паўстанне Емяльяна Пугачова з'явілася сур'ёзным выпрабаваннем для самадзяржаўнай царскай улады. У знешняй палітыцы Кацярына II была прамой паслядоўніцай Пятра Вялікага. Яна паспяхова працягнула яго справу і завяршыла ператварэнне Расійскай імперыі ў вялікую сусветную дзяржаву.*

***Ключавыя словы:*** *«эпоха палацавых пераваротаў», Кацярына II, Даравальная грамата дваранству, Емяльян Пугачоў.*

**Пытанні і заданні**

1. Чаму ў расійскай гісторыі перыяд з 1725 па 1762 г. атрымаў назву «эпохі палацавых пераваротаў»?
2. У чым палітыка Кацярыны была працягам палітыкі Пятра I?
3. Як у час праўлення Кацярыны II змянілася становішча дваран? Як змянілася становішча сялян?
4. Складзіце расказ пра сялянскае паўстанне 1773–1775 гг. па наступным плане: а) прычыны паўстання; б) правадыр паўстання і асноўныя ўдзельнікі; в) тэрыторыя пашырэння паўстання; г) вынік паўстання. Пры адказе выкарыстайце картасхему на с. 175.
5. Складзіце ў сшытку схему «Асноўныя кірункі знешняй палітыкі Кацярыны II».

# § 26. Руская культура XVI–XVIII стст.

**1 сакавіка 1564 г.** **1687 г.** **1724 г.** **1755 г.**

**Успомніце.** *Якія змены ў культурным жыцці Заходняй Еўропы адбыліся пад уплывам ідэй Адраджэння і Асветніцтва?*

Утварэнне адзінай Расійскай дзяржавы аказала велізарны ўплыў на развіццё культуры. Рост велічы і магутнасці дзяржавы адлюстраваўся ў творах дойлідства, жывапісу і літаратуры.

**Вы даведаецеся.** *Якія змены адбыліся ў рускай культуры ў XVI–XVIII стст. Чым гэтыя змены былі выкліканы.*

**1. Вусная народная творчасць.** Змаганне са знешнімі ворагамі і фарміраванне адзінай Расійскай дзяржавы знайшлі адлюстраванне ў народнай творчасці (фальклоры). Адным з улюбёных герояў рускіх былін зрабіўся Сцяпан Разін.

Шмат гістарычных песень было складзена пра Івана IV. Лютага цара ўслаўлялі за барацьбу са знешнімі ворагамі і асуджалі за жорсткасць і крывапраліцце.